# СУВЯЗЬ САРМАЦКІХ ПАРТРЭТАЎ З АНТЫЧНЫМ МАСТАЦТВАМ

**Царэвіч Ю. Д.**
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Гісторыя партрэтнага мастацтва ВКЛ адлюстроўвае шматгранную эвалюцыю светапоглядаў нашых продкаў, працэсы развіцця і ўзбагачэння беларускай культуры, бо, па сутнасці, партрэт чалавека заўсёды з'яўляецца люстэркам эпохі. Творы жывапісу дапамагаюць зразумець эпоху, адчуць яе дух і нават уявіць сябе побач з людзьмі таго часу. Мэта артыкула: зрабіць спробу прасачыць сувязь сармацкіх партрэтаў з антычным мастацтвам.

Радзівілы – княжацкая фамілія, прадстаўнікі якой дастойныя бясмяротнай славы. На колькі паважанымі і знатнымі былі Марцэлій і Сцыпіён сярод рымлян, Аляксандр сярод макідонцаў, Канстанцін сярод візантыйцаў, на столькі Радзівілы – найшаноўная фамілія сярод сарматаў. Параўнанне з антычнымі героямі і імператарамі ў творах пра сарматаў, указвае на характэрную асаблівасць культуры Вялікага Княства Літоўскага, якая сцвярджала, што яе карані бяруць пачатак у грэчаскай і рымскай старажытнасці, і адначасова залічала магнатэрыю да нашчадкаў апісанага гістрорыкам Герадотам (V ст. да н.э.) племені сарматаў.

Шляхта, якая выводзіла сваё паходжанне ад старажытнага племя сарматаў імкнулася ствараючы свой радавод, пацвердзіць сваю прыналежнасць да правадыроў старажытных рымскіх плямёнаў. Паралельна з складаннем генеалагічнага дрэва, з'явілася цікавасць бачыць продкаў візуальна на партрэце. Такія выявы выконвалі акрамя генеалагічных выхаваўчую функцыю. Моладзь і дзеці літэральна раслі на легендах аб сваіх продках, ведалі, у якіх войнах яны ўдзельнічалі, якім чынам праславіліся перад айчынай, як выконвалі свой абавязак грамадзяніна. Партрэты насілі эстэтычную і адукацыйную функцыі, таму партрэтныя галерэі размяшчаліся ў парадных камінных залах, у рыцарскіх залах. Магнацкія сем'і, такія як Радзівілы, валодалі вялікімі партрэтнымі галерэямі, нават небагаты шляхціч імкнуўся мець партрэты сям'і і продкаў да 5 пакалення.

У Антычнасці права на партрэт належыла не ўсім. У старажытным Рыме такое права давалася толькі знаці за заслугі перад айчынай. Скульптурныя партрэты ствараліся на аснове пасмяротнай маскі. У адрозненні ад пасмяротных рымскіх масак, сярэднявяковыя партрэтныя выявы былі далекія ад фізіялагічнага падабенства, больш таго, да падабенства тады не імкнуліся, таму што галоўным у выяве была душа, месца чалавека ў гарамадстве, нават адлюстраванне быційнага цела павінна было служыць пастаўленай высокай мэце.

У еўрапейскай культуры, у еўрапейскім мастацтве партрэт распаўсюдзіўся ў сярэдзіне XV стагоддзя, узнікае як жаданне у італьянскім кватрачэнта (ранняга Адраджэння) адлюстраваць чалавека ў бясконцым шэрагу стагоддзяў гісторыі. Першыя партрэты, якія, напрыклад, выконваў Пьеро дэла Франчэска, гэта партрэты князёў, сучаснікаў у акружэнні вядомых гістарычных дзеячаў мінулых эпох. Партрэт набывае свой асноўны сімвалічны сэнс – пераход з матэрыяльнага свету у надматэрыяльны, г.зн. за ўзор бярэцца рымскае паданне аб магчымасці увекавечыць толькі таго, хто годны мець славу ў стагоддзях (годны муж, рыцар).

Калі партрэт з набытай сімволікай прыходзіць у Вялікае Княства Літоўскае, ён з'яўляецца паралельна з вялікай колькасцю арыгінальных і перакладных антычных літаратурных твораў, тэалагічных сярэднявечных твораў. Філосафы Вялікага Княства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літоўскага спрабуюць прадставіць гісторыю дзяржавы, гісторыю магнацкіх родаў як пераемніцу антычных традыцый. Радзівілы і іншыя магнацкія роды пры заказе партрэтаў спрабуюць знайсці сэнсавую дамінанту прадстаўнікоў свайго рода ў еўрапейскай гісторыі.

Радзівілы жадалі пазнаць і зразумець сябе, таму заказвалі сачыненні знакамітых гісторыкаў XVI ст. (напрыклад, хронікі Страйкоўскага). У гэты ж час з’яўляюцца пазнавальныя творы аб мужнасці, рыцарстве і жыцці народа Жамойскага, Рускага і г.д. У дадзеным выпадку гаворыцца аб імкненні ўбачыць сябе збоку, даказаць ролю прадстаўнікоў рода ў гісторыі, набыць права быць адлюстраваным у творах мастацтва. Фамільныя галерэі, як наследаванне рымскай традыцыі, становяцца абавязковымі для кожнай еўрапейскай сям’і, якая хацела падкрэсліць глыбіню і старажытнасць сваіх родавых каранёў. Адначасова, як і ва ўсёй Еўропе, традыцыя партрэтных увасабленняў укараняецца ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Парадныя партрэты – агульнаеўрапейская традыцыя насычэння палацаў, інтэр’ераў парадных пакояў. Радзівілы, Вішнявецкія, Сангушскія, Астрожскія заказвалі партрэты мясцовым майстрам або прыезджым заходнееўрапейскім мастакам (нямецкім, французскім, італьянскім). На партрэце асоба павінна была паўставаць сімвалічна, чалавек прадстаўляўся як вяльможны магнат і дзяржаўны дзеяч. Некаторымі дэталямі, элементамі падкрэсліваўся род заняткаў таго або іншага чалавека. У традыцыях сармацкага партрэта абавязкова павінны былі адлюстроўвацца прадметы-сімвалы, якія ўказвалі сацыяльныя функцыі: зброя, булава і інш., калі партрэтуемы прыняў пострыг – распяцце, ружанец, ікона. У партрэце Альбрэхта Станіслава Радзівіла – канцлерская пячатка, якая ўказвае на пасаду канцлера.

Партрэты замалёўваліся графічна, выконваліся копіі для партрэтных галерэй у некалькіх замках. Назва альбома партрэтаў князёў Радзівілаў пачынаецца са слова «icones». У сярэднявяковым хрысціянскім жывапісе больш вядома паняцце «ікона». Назва для альбома дакладная ў тым разуменні, якое слову «icones» надавалі ў антычнай і раннехрысціянскай культуры. Гэта, перш за ўсё, выявы памерлых, але шанаваных людзей, біяграфіі якіх ператварыліся ў своеасаблівае «Жыціе», г.зн. уяўляюць павучальны для ўсіх узор жыццёвага подзвіга. Такія тыпы партрэтаў выконваліся пасмяротна і размяшчаліся не толькі ў палацах, але і ў храмах, у крыптах.

Партрэты «icones» маюць двухчасткавую кампазіцыю: уверсе ў авале ўпісаны ў прамавугольнік твар і торс увасобленага, унізе прамавугольны картуш з надпісам, інскрыпцыяй і гербам. Кампазіцыя падкрэслівае мемарыяльную, якая звернута да памяці нашчадкаў, значнасць вобраза. Так ствараецца нейкі код арыстакратычнай фаміліі, што дае падставы супастаўляць партрэт з эмблемай, структура якой траістая: выява, дэвіз, або герб, і інскрыпцыя (паясняльны надпіс). У дадзеным выпадку можна гаварыць пра еўрапейскую агульнасць і тыпалогію партрэтнага вобраза, а таксама пра сувязь з рымскай традыцыяй, як асаблівай формай ідэалагічна значнага ўяўлення арыстакратыі і шляхты Вялікага Княства Літоўскага.

Найвялікшую славу, але і загадку для даследчыкаў складаюць партрэты ў лаўровым вянку. Яны быццам уяўляюць сабой шматмерную прастору, лаўровы вянок – гэта ўжо знак славы, унізе размяшчаецца арол – напрыклад, гербавы знак князёў Радзівілаў, які з’яўляецца знакам рымскай славы, вельмі важным, паколькі ён знаходзіцца ў гербе многіх еўрапейскіх краін. Усю кампазіцыю, як пастамент славы, завяршае надпіс на скручаным світку, на якім пазначана ўсё тое, што трэба ведаць аб партрэтаваным: імя, год нараджэння, пасада, бацькі, дзеці і г.д.

З XV–XVI стст. Засталіся партрэты ў невялікай колькасці, заснавальнікаў роду, прадстаўнікоў азначаных стагоддзяў маглі адлюстроўваць на партрэтах пазнейшага часу як з ранейшых узораў так і па апісанні. Больш захавалася партрэтаў XVII ст., пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтым як жывапісных, так і графічных. З сярэдзіны XVI ст. шляхта Вялікага Княства Літоўскага спрабуе далучыць сябе ў агульны струмень еўрапейскай гісторыі і ўбачыць свае карані ў падзеях антычнай траянскай вайны, у падзеях, апісаных Гамерам, у яго эпасах «Іліяда і Адысея». Сувязь з антычнасцю, з рымскай культурай надзвычай відавочная, таму што ў партрэтах бачны, першым чынам, жывапісны дакумент, у якім сціплымі абагульненымі сродкамі-сімваламі перадавалася нашчадкам праграма чалавечага лёсу, прыклад жыцця знакамітага продка. У ім праўдзівасць у перадачы рыс твару і наогул аблічча мадэлі спалучалася з пафасам у падкрэсліванні сацыяльнага становішча героя, яго жыццёвага прызначэння. Падобна да іконы, жывапісны твор – партрэт служыў сродкам пранікнення ў святая святых, даваў магчымасць выказаць нешта большае, чым можна сказаць словамі ці перадаць у дакладным рэалістычным малюнку. Звяртаючыся да прыёмаў экспрэсіўнай дэфармацыі малюнка, да напружанага каларыстычнага ладу карціны, жывапісцы падкрэслівалі ў партрэце ў першую чаргу не мімалётны стан душы і індывідуальныя рысы асобы, а манументальную параднасць вобраза, сацыяльную значнасць адлюстраванага чалавека [6, с. 59]. Пры дапамозе атрыбутаў – сімвалаў улады мастакі паказвалі высокае становішча чалавека ў дзяржаве, нагадвалі важныя абставіны яго біяграфіі – усё тое, што вылучала яго на віднае месца ў грамадстве і забяспечвала, на думку сучаснікаў, памяць нашчадкаў.

***Літаратура***

1. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя. – 2005. – 688 с.: іл.

2. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдакл.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. 2006. – 792 с.: іл.

3. Дыяруш князя Міхаіла Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага, гетмана ВКЛ // Спадчына. – 1994. – № 4.

4. Махлаюк, А. В. Армия Римской империи. Очерки традиций и ментальность: Монография / А. В. Махлаюк. – Нижний Новгород: Изд-во Нижегородского государственного ун-та им. Н. И. Лобачевского, 2000. – 235 с.

5. Тананаева, Л. И. Сарматский портрет. Из эпохи польского портрета эпохи Барокко / Л. И. Тананаева; под ред. Д-ра иск. В. Н. Прокофьева. – М.: Наука, 1979. – 304 с.: ил.

6. Хадыка, А. Ю. Непаўторныя рысы / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка // З гісторыі беларускага партрэта. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ